*Я. А. Гарадніцкі,*
*кандыдат філалагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# СТАНАЎЛЕННЕ КЛАСІЧНАЙ ПЛЫНІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧАТКУ XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станаўленне новай беларускай літаратуры на пачатку XX ст. адбывалася ў даволі складаных умовах. Гэта быў час вялікіх ідэйных і сацыяльных узрушэнняў, чаканняў кардынальных змен ва ўсіх сферах жыцця чалавека і грамадства. Сацыяльныя ідэі першай рускай рэвалюцыі спалучаліся з нацыянальна-вызваленчым рухам, у які былі залучаны многія народы адной з буйнейшых на той час сусветных імперый.

У гэты адказны перыяд фарміравання нацыі сацыяльныя і нацыянальныя вектары гістарычнага развіцця натуральным чынам сумяшчаліся ў свядомасці беларускай інтэлігенцыі. Цалкам слушным з’яўляецца традыцыйнае суаднясенне ўздыму нацыянальнай культуры з рэвалюцыйнымі падзеямі 1905 г. Атрыманыя ў выніку гэтага пэўныя ліберальныя заваёвы, важнейшай з якіх для беларускай культуры была легалізацыя беларускай мовы, значна паўплывалі на далейшае, і прытым вельмі актыўнае, паскоранае, развіццё маладой беларускай літаратуры.

Неабходна ўлічваць, вядома, і тое, што к гэтаму часу даў аб сабе знаць таксама і ўнутраны творчы патэнцыял беларускага слоўнага мастацтва, які пакрысе назапашваўся і выспяваў у не вельмі спрыяльных знешніх абставінах XIX ст.

Пры разглядзе станаўлення беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду звычайна і абмяжоўваюцца ўказаннем на гэтыя два сапраўды надзвычай істотныя фактары: сацыяльны і нацыянальны. Аднак імі не вычэрпваецца характарыстыка гістарычнага кантэксту, у якім адбывалася фарміраванне літаратуры беларускага народа. Фактараў было значна больш, і іх неабходна таксама ўлічваць.

Рэвалюцыянізуючыя тэндэнцыі назіраліся на пачатку XX ст. не толькі ў сацыяльнай і нацыянальнай сферах, яны закраналі таксама і сферу навуковую і вытворчую, выяўляліся ў мастацкай творчасці. Сумежжа XIX і XX стст. – гэта час узнікнення дэкадэнцкіх і авангардных з’яў у мастацтве і літаратуры. Дадзеная акалічнасць пачынае сёння ўлічвацца даследчыкамі беларускай літаратуры першых дзесяцігоддзяў XX ст.

Сёння ўсё больш актыўна разглядаюцца праявы ў беларускай

літаратуры гэтага часу нерэалістычных мастацкіх напрамкаў і стылявых плыней, напрыклад сімвалізму, імпрэсіянізму, неарамантызму і да т. п. Такая тэндэнцыя заканамерная, паколькі яна сведчыць пра імкненне суадносіць развіццё беларускай літаратуры з сусветным мастацкім працэсам. Пытанне прытым узнікае метадалагічнага плану: наколькі выразна акрэсленым прадстае ў беларускай літаратурнай сітуацыі той або іншы напрамак або стыль.

Працэс карэляцыі развіцця нацыянальнай літаратуры, і ў прыватнасці паэзіі, з тэндэнцыямі сусветнай літаратуры адпаведнага часу з'яўляецца, на нашу думку, пытаннем складаным, патрабуючым паглыбленага спецыяльнага вывучэння. Пры яго разглядзе патрэбна ўлічваць як уласна літаратурныя, так і пазалітаратурныя фактары і абставіны, нацыянальны і сусветны мастацкія кантэксты ў іх узаемадзеянні і многія іншыя аспекты.

Не выклікае сумнення той факт, што для светаўспрымання некаторых беларускіх паэтаў пачатку XX ст. была характэрна даволі змрочная танальнасць, прасякнутасць адчуваннямі крызіснага стану гістарычнага развіцця, у іх творчасці можна знайсці катастрафічныя і эсхаталагічныя матывы. Асабліва выразна гэтыя тэндэнцыі выявіліся ў паэзіі Янкі Купалы разглядаемага перыяду. Аднак падобныя вобразы і матывы можна сустрэць і ў цэлым гарманічна ўраўнаважанага паэта, якім быў М. Багдановіч. Варта згадаць хаця б такія яго вершы, як «Дзесь у хмарах жывуць павукі...», «Разрытая магіла».

Найбольш яскрава катастрафічнае бачанне маніфестуецца ў вершы Я. Купалы «Разлад». Вобразную тканку верша сапраўды наскрозь прасякае адчуванне сусветнага разладу, татальнага разбурэння маральных асноў людскіх узаемадачыненняў. «*Няпраўда праўду акялзала / І едзе людскасці па спіне...*» [1, с. 190] – у такім сімволіка-алегарычным выглядзе паўстае свет у творы паэта. У вершы дакладна абазначаецца віноўнік усясветнага разладу, называецца яго імя – *чорт*.

Звернемся, аднак, да той мастацкай формы, у якой увасабляецца вобразны змест дадзенага твора. Верш напісаны ў звыклым для Я. Купалы размерана-рытмічным ключы. Рытміка-інтанацыйнай дамінантай, як і ў многіх іншых купалаўскіх вершах, выступае тут выразна выяўленая сінтаксічная структураванасць, заснаваная на развіцці дыхатамічнай суаднесенасці вобразаў. Свет, у якім пануе *разлад*, пры яго мастацкім пераўтварэнні набывае рысы гарманічнай упарадкаванасці, падпарадкоўваецца законам эстэтычнага выражэння. Тым самым слова паэта, выяўляючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бачанне аўтарам рэчаіснасці ў яе без усякіх прыкрас выглядзе, паказваючы жыццё як арэну змагання дабра і зла, скіравана разам з тым і на тое, каб унесці ў жыццё чалавека пэўныя пазітыўныя праявы праз эстэтызацыю, мастацкую апрацоўку паэтычнага выказвання.

Мастацкі свет Я. Купалы, у якім па-свойму праламляюцца імпрэсіянісцкія, сімвалісцкія і неарамантычныя стылявыя прыкметы, усё ж такі трывала суадносіцца з рэальным жыццём. Аднак гэта менавіта свет *мастацкі*, г. зн. арганізаваны па мастацкіх законах. У ім стыхійнасць суб'ектыўных адчуванняў, эмацыянальнасць паэтычных парыванняў ураўнаважваюцца дынамічнай, але адначасова і выразна структураванай формай мастацкага ўвасаблення.

Сацыяльнае і эстэтычнае актыўна ўзаемадзейнічаюць якраз у тым выпадку, калі мастацкая форма прадстае як дзейсны фактар уздзеяння на свядомасць чытача, калі яна выконвае не толькі свае спецыфічныя функцыі мастацкага выражэння, але і з'яўляецца асновай для пашырэння духоўных і светапоглядных далягляд аў рэцыпіента. Асаблівы эфект ад узаемадзеяння сацыяльных і эстэтычных, мастацкіх аспектаў паэтычнай творчасці назіраецца, на нашу думку, тады, калі ёсць падставы гаварыць пра характэрныя прыкметы класічнага стылю ў паэзіі.

Беларуская паэзія класічнага кшталту фарміравалася якраз у той час, калі рэалістычны стыль уваходзіў у актыўнае ўзаемадзеянне са стылямі іншай накіраванасці. Аднак пры гэтым захоўвалася ў якасці вызначальнай сутнасная адметнасць гэтай плыні, а менавіта яе жыццесцвярджальны патэнцыял, пазітыўная скіраванасць на важнейшыя духоўныя і маральныя каштоўнасці, на пошукі трывалай экзістэнцыйнай апоры ў жыцці чалавека.

Дадзеныя светапоглядныя ўстаноўкі выражаліся не толькі ў непасрэдна сфармуляваным і выяўленым у паэтычным дыскурсе выглядзе, але і праз мастацкую форму, рытміка-інтанацыйную арганізацыю паэтычнага выказвання, гукапіс. Некаторыя даследчыкі, на жаль, не звяртаюць належнай увагі на гэту акалічнасць. Таму для іх прыналежнасць таго ці іншага паэтычнага твора, або творчасці аўтара ў цэлым, да пэўнага мастацкага напрамку і стылявой плыні вызначаецца выключна тым, што непасрэдна выказваецца аўтарам або лірычным героем.

Беларуская класічная паэзія, станаўленне якой адбывалася ва ўмовах актывізацыі ў сусветным літаратурным працэсе авангардысцкіх і мадэрнісцкіх тэндэнцый, аказвала ўздзеянне на свядомасць і светапогляд свайго чытача не ў апошнюю чаргу і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваёй формай, спосабам структурнай арганізацыі жыццёвага і мастацкага матэрыялу. І ў гэтым плане пазітыўнае ўздзеянне мастацкай формы зыходзіла не толькі ад М. Багдановіча, намаганні якога былі сканцэнтраваны на давядзенні фармальных кампанентаў верша да гранічнай ступені дасканаласці. Але Я. Купала і Я. Колас, А. Гарун, З. Бядуля, іншыя паэты сцвярджалі сваёй творчасцю прынцыпы класічнага стаўлення да верша як формы і спосабу паэтычнага выражэння.

Традыцыі, закладзеныя пачынальнікамі класічнай плыні беларускай паэзіі, былі затым прадоўжаны і развіты іх наступнікамі. У 1920-я гг. найбольш значныя дасягненні ў распрацоўцы класічнай формы верша мелі У. Жылка і У. Дубоўка. Пры несумненнай індывідуальна-стылявой і светапогляднай арыгінальнасці гэтых паэтаў іх аб’ядноўвае як з папярэднікамі, так і з наступнікамі разуменне таго пазітыўнага ўздзеяння на чытача, якое можа аказаць не толькі непасрэдны зварот, заклік і да т. п., але і сама форма выказвання. Адсюль і тая вялікая ўвага, якая надавалася прадстаўнікамі класічнага напрамку ў паэзіі пытанням творчасці, тэме мастацтва. Глыбокія роздумы пра прыроду мастацтва і яго прызначэнне знаходзім у творах Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Жылкі, А. Куляшова, У. Караткевіча, інш.

Вызначаная А. Куляшовым у якасці творчага крэда адказнасць паэта «перад строгім вершам, / Перад яго пачаткам і канцом» [2, с. 51] – гэта, па сутнасці, маніфестацыя творчай праграмы ўсёй класічнай беларускай паэзіі.

---

1. *Купала, Я.* Збор твораў: у 7 т. / Янка Купала. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – Т. 1. Вершы. Пераклады. 1904–1907. – 535 с.

2. *Куляшоў, А.* Сасна і бяроза: кніга паэзіі / Аркадзь Куляшоў. – Мінск : Беларусь, 1970. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ